Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

24 КРАСАВІКА 2007 г. АЎТОРАК

№ 75 (25940)

Кошт 350 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЗАЯВІЎ АБ НАМЕРЫ СТРОГА КАНТРАЛЯВАЦЬ ЦЭНЫ НА БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛЬНАГА ЖЫЛЛЯ

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 красавіка па традыцыі прыняў удзел у рэспубліканскім суботніку.

У гэтым годзе, як і ў мінулым, Прэзідэнт працаваў на будаўніцтве шматфункцыянальнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна».

У складзе брыгады рабочых, у якую ўвайшлі таксама міністр унутраных спраў Уладзімір Навумаў, мэр Мінска Міхаіл Паўлаў і спартсмены, Аляксандр Лукашэнка ўкладваў бетон пад падлогу памяшканняў.

Пасля завяршэння работы на суботніку кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні журналістаў. Прэзідэнт заявіў, што ў Беларусі будзе прадоўжана ўзвядзенне буйных аб'ектаў агульнанацыянальнага значэння, такіх як комплекс «Мінск-Арэна».

Ён выказаў занепакоенасць высокімі цэнамі на будаўніцтва, у тым ліку спартыўных, сацыяльных аб'ектаў і жылля. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што лічыць недастатковай работу ўрада па змяншэнню кошту будаўніцтва, і паведаміў, што ў другой палавіне гэтага года мае намер вярнуцца да разгляду гэтай праблемы «з самых жорсткіх пазіцый». Гаворачы аб прычынах высокіх цэн на будаўніцтва жылля, Прэзідэнт адзначыў, што попыт у гэтай сферы значна перавышае прапанаванне, адсюль фарміруецца цана. «Мы ўсе жывём у рынкавых умовах», — растлумачыў ён.

Аднак, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у гэты працэс умяшалася дзяржава. «Мы ўзялі пад кантроль чаргавікоў, аднавілі савецкія чэргі (ні ў адной краіне гэтага не засталося). Мы захавалі чэргі для тых, хто жыллё яшчэ не атрымліваў і хто ў ім мае патрэбу. І гэтыя цэны мы кантралюем — яны напалавіну ніжэйшыя за рынкавыя. Моладзі даём ільготныя крэдыты. Гэта значыць, сацыяльнае жыллё па цэнах мы стараемся кантраляваць», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым, назіраецца рост цэн на ўсе катэгорыі жылля. Сярод аб'ектыўных прычын — падаражэнне энерганосьбітаў, павышэнне цэн, у тым ліку на будматэрыялы, затраты на аднаўленне будаўнічай галіны, якое будзе поўнасцю завершана толькі да канца гэтай пяцігодкі.

«Але ў мяне, як і ў людзей, вельмі шмат пытанняў да органаў улады і самі́х будаўнікоў. І ў бліжэйшы час мы гэтыя пытанні разгледзім. Людзі будуць ведаць, да якога мы прыйдзем рашэння», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Паглядзім, што ўдасца зрабіць па цане, хоць у Беларусі цэны самыя нізкія на будаўніцтва, таму што дзяржава ўмешваецца ў гэты працэс», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым ён заўважыў, што нізкая цана на будаўніцтва жылля прыводзе да зніжэння зарплаты будаўнікам, цэн на будматэрыялы, «а там таксама людзі і патрэбна мадэрнізацыя вытворчасці».

Каментуючы па просьбе журналістаў вынікі свайго нядаўняга візіту ў Аман і Індыю, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў час наведвання Амана беларускі бок азнаёміўся з магчымасцямі гэтай краіны і вызначыў перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва. Ён падкрэсліў, што ў аманскага боку ёсць інтарэс да развіцця супрацоўніцтва з Беларуссю ва ўсіх сферах, у тым ліку ў плане інвестыцый. Як чакаецца, у бліжэйшы час для абмеркавання далейшых крокаў па развіццю ўзаемадзеяння Беларусь наведае дэлегацыя дзелавых колаў Амана.

Што датычыцца Індыі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта «каласальная краіна і вельмі вялікі рынак». Паводле яго слоў, індыйскі бок гатовы да сур'ёзнай прысутнасці Беларусі на сваім рынку. Аб гэтым сведчыць і прапанова кіраўніцтва Індыі аб павелічэнні тавараабароту з нашай краінай да $500 млн да 2010 года.

Як адзначыў Прэзідэнт, індыйскі бок заявіў аб зацікаўленасці набыць беларускую тэхніку і абсталяванне для развіцця дарожнага будаўніцтва і сельскай гаспадаркі. Перспектыўнымі напрамкамі супрацоўніцтва з Індыяй кіраўнік дзяржавы назваў таксама ваенна-тэхнічнае і навукова-тэхнічнае ўзаемадзеянне.

Прадстаўнікоў СМІ цікавіла таксама думка Прэзідэнта, чаму дамоўленасці з той або іншай краінай аб прыцягненні інвестыцый не заўсёды атрымліваюць належную рэалізацыю. На гэта кіраўнік дзяржавы адказаў: «Інвестыцыі сёння не галоўнае, галоўнае — праекты».

Ён растлумачыў, што замежныя інвестары часта прапануюць праекты на ўмовах, якія не задавольваюць нашу дзяржаву, напрыклад, без выплаты падаткаў. Яшчэ адна прычына таго, што не ўсе праекты рэалізуюцца, — прамарудкванне і бюракратызм беларускіх чыноўнікаў.

Прэзідэнт адзначыў, што інвестыцыйная дзейнасць недастаткова развіта, напрыклад, у ваенна-прамысловым комплексе краіны — гэта стала зразумела пасля нядаўняй справаздачы Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. «Хоць мы захавалі і аднавілі гэты сектар, ён нядрэнна развіваецца, але гэта пакуль не зусім тое, што нам патрэбна», — сказаў беларускі лідар.

Гэта яшчэ адна актуальная праблема, на вырашэнні якой кіраўніцтва краіны акцэнтуе ўвагу ў бліжэйшы час.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Пенсійная рэформа

«КАМПЕНСАЦЫЯ». АБО ПРЫБАЎКА ДА ЗАРПЛАТЫ?

Паводле прагнозаў спецыялістаў, з 2007 года ў Беларусі пачнецца змяншэнне прыросту працоўных рэсурсаў. І адначасова — павелічэнне колькасці асобаў у пенсійным узросце. Прычым не сакрэт, што абедзве гэтыя акалічнасці натуральна паўплываюць на стан айчыннай пенсійнай сістэмы, і больш за тое — рана ці позна стануць «зыходным пунктам» для яе пераўтварэнняў. Між тым, у якім напрамку можа пайсці пенсійная рэформа ў нашай краіне, якія варыянты тут з'яўляюцца перспектыўнымі ці наадварот непрымальнымі? Аб гэтым — наша сённяшняя гутарка з начальнікам аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццянай ПАГОНЫШАВАЙ.

— Для пачатку давайце паспрабуем удакладніць: колькі пенсіянераў у Беларусі зараз? І наколькі здольна задаволіць іх інтарэсы наша пенсійная сістэма?

— Зараз на ўліку толькі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне знаходзяцца 2 млн 437,2 тыс. пенсіянераў. І, у прыватнасці, з іх 1 млн 908,6 тыс. чалавек (ці 78,3 працэнта ад агульнай колькасці) атрымліваюць пенсіі па ўзросту, 294,2 тысячы (12,1 працэнта) — па інваліднасці, 149,3 тысячы (6,1 працэнта) — па страце карміцеля, 52 тысячы (2,1 працэнта) — сацыяльныя пенсіі, 19,2 тысячы (0,8 працэнта) — пенсіі за выслугу гадоў, а 14,7 тыс. чалавек — пенсіі па інваліднасці і па страце карміцеля на падставе Закона «Аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых, асобаў кіруючага і радавога саставу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў».

Пры гэтым пенсійная сістэма ў Беларусі пабудавана на традыцыйнай для Еўропы схеме салідарнай адказнасці паміж пакаленнямі і ўнутры пакалення. Яе сутнасць у тым, што працуючая частка насельніцтва за кошт бягучых ўзносаў «збірае» пэўную суму грошай. А далей за кошт гэтых грошай робіцца зноў-такі «бягучая» выплата пенсій. Дарэчы, для большасці работадаўцаў памер такіх узносаў складае 29 працэнтаў ад фонду зарплаты (для асобных катэгорый плацельшчыкаў тут існуюць пэўныя льготы), а для работнікаў — 1 працэнт ад індывідуальнай зарплаты.

Варта заўважыць адразу, што цяперашняя пенсійная мадэль працавала дзесяцігоддзямі. І працавала даволі паспяхова. Разам з тым казаць, што яна не мае ніякіх хібаў, безумоўна, нельга. Так, адзін з істотных недахопаў — значнае пераразмеркаванне пенсійных сродкаў. У сучасную пенсійную сістэму лёгка ўпісваюцца разнастайныя льготы — залік у стаж перыядаў работы без выплаты страхавых узносаў, асаблівае вылічэнне стажу для асобных катэгорый работнікаў, магчымасць выбару пенсіянерам перыяду з больш высокім заробкам для вылічэння індывідуальнага каэфіцыента, зніжэнне агульнаўсталяванага пенсійнага ўзросту, да прыкладу, па ўмовах працы, шматдзетным маці, бацькам дзіцяці-інваліда, інвалідам з дзяцінства, беспрацоўным, нарэшце, шэраг іншых «прывілей». Пры гэтым ільготы адным пенсіянерам на справе аплачваюцца за кошт астатніх.

Аднак ці не галоўная праблема цяперашняй сістэмы — захаванне фінансавай стабільнасці ва ўмовах старэння насельніцтва. І менавіта апошняя акалічнасць на сёння — фактар рызыкі нумар адзін.

— Менш плацельшчыкаў узносаў, больш атрымальнікаў пенсій — такі прагноз даводзіцца чуць ужо не першы год. Тым не менш, што мы маем у выніку?

— Калі ў большасці эканамічна развітых краін доля пенсіянераў пакуль складае 22—23 працэнты ад агульнай колькасці насельніцтва, то ў нас сёння тыя ці іншыя пенсіі атрымліваюць 26 працэнтаў грамадзян. Пры гэтым нават па самых аптымістычных прагнозах да 2020 года гэты паказчык у Беларусі ўзрасце да 28 працэнтаў.

Між тым, «пенсійная праблема» падаецца значнай ужо зараз. На пенсійныя выплаты ў Беларусі выдаткоўваецца каля 11 працэнтаў ВУП, што з'яўляецца адным з самых высокіх паказчыкаў сярод краін СНД і Балтыі. А цана гэтаму — больш высокая страхавая нагрузка на фонд зарплаты, што не можа не ўплываць на кошт айчынных тавараў ці паслуг, і ўрэшце — на іх канкурэнтаздольнасць.

— У сувязі з гэтым, ці не настаў час, па прыкладу некаторых постсацыялістычных краін, змяніць саму пенсійную мадэль?

— Прыхільнікаў змены спосабу фінансавання пенсій і замены цяперашняй размеркавальнай схемы на накапляльную сёння не так ужо і мала. Прычым адны разглядаюць накапленні пенсійнага капіталу кожным канкрэтным работнікам менавіта на сваім індывідуальным рахунку як лепшы сродак ліквідацыі «ўраўнілаўкі». А іншыя (паколькі мяркуецца, што сродкі на індывідуальных рахунках павінны ўвесь час не толькі назапашвацца, але адначасова інвеставацца і «прырастаць») бачаць накапленні як шлях змякчэння «дэмаграфічных наступстваў».

Сапраўды, у нечым з падобнымі меркаваннямі можна пагадзіцца. Аднак толькі часткова. Бо радыкальны варыянт поўнай замены размеркавальна-салідарнага прынцыпу на прынцып накапленняў вельмі рызыкоўны і, на думку многіх экспертаў, ненадзейны. На працягу такога вялікага перыяду, як жыццё цэлага пакалення, нельга выключыць эканамічныя катаклізмы, якія могуць прывесці да абясцэньвання сродкаў на асабістых рахунках.

Да таго ж у дадзеным выпадку існуе адна немалаважная акалічнасць. Пераход да накапляльнай сістэмы азначае, што, прынамсі, частка ўзносаў, якую плаціць цяперашняе пакаленне работнікаў, павінна пайсці на іх асабістыя рахункі і фінансаванне іх уласных пенсій. Адпаведна, гэтыя ўзносы не могуць выкарыстоўвацца для фінансавання пенсій цяперашнім пенсіянерам. Аднак адмяніць для апошніх пенсіі немагчыма. Таму для пераходу на накапленні патрэбныя дадатковыя рэсурсы — узамен тым, што пайшлі б на асабістыя рахункі. А гэта велізарныя сродкі, для краіны яны ацэньваюцца прыкладна ў 300 працэнтаў ВУП. Прычым аб вырашэнні праблемы праз вызначэнне дадатковага страхавога ўзносу не можа быць гаворкі: сёння такі ўзнос у нас і без таго адзін з самых высокіх.

Такім чынам, атрымліваецца, што мэтазгоднасць замены мадэлі фінансавання пенсій з салідарнай на накапляльную падаецца вельмі сумнеўнай. Тым больш, што падобную змену наўрад ці забяспечыць наша эканоміка.

Сяргей ГРЫБ.

(Заканчэнне ў наступным нумары).

Прэзідэнцкае Пасланне да беларускага народа і Нацыянальнага сходу

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 24 красавіка прыме ўдзел у сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Кіраўнік дзяржавы звернецца з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Прамая трансляцыя пачнецца ў 12 гадзін па трох вядучых беларускіх тэлеканалах і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДА ВЫХАДНЫХ ІСТОТНА ПАЦЯПЛЕЕ

У бліжэйшыя дні на тэрыторыю Беларусі завітае цёплае паветра. Аднак, як паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава, сёння чакаюцца невялікія дажджы. Тэмпература паветра — 10—16 градусаў, а ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях — да 20. Ужо 24 красавіка над тэрыторыяй Беларусі ападкаў увогуле не будзе. У ноч на сераду яшчэ халаднавата — 1—8 цяпла, удзень — 14—20. Сапраўды камфортнае сонечнае надвор'е ўсталюецца ў чацвер—пятніцу, калі тэмпература паветра будзе дасягаць 16—22 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

сообщает, что по итогам работы за 2006 год согласно решению годового Общего собрания акционеров от 29 марта 2007 года, протокол № 5, с 3 мая 2007 года начнется выплата дивидендов по привилегированным и простым акциям банка.

Выплата дивидендов производится в филиалах и отделениях банка.

Дополнительную информацию можно получить по телефонам: (8-017) 228 53 03, 228 58 04.

Юридический адрес: 220036 г. Минск, пр-т Жукова, 3.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ПЕРШЫ ПРЭЗІДЭНТ РФ

Першы прэзідэнт Расіі Барыс Мікалаевіч Ельцын памёр у панядзелак 23 красавіка на 77-м годзе жыцця.

Паводле інфармацыі з неназваных медыцынскіх крыніц, прычынай смерці стала раптоўнае спыненне сэрца. Месца і час пахавання ўчора вызначаны не былі.

У ФРАНЦЫІ ЛІДЗІРУЕ СЯБРА БУША І СААКАШВІЛІ

У Францыі завершаны падлік галасоў на прэзідэнцкіх выбарах. Як паведаміла МУС Францыі, якое адказвае за правядзенне галасавання, лепшы вынік паказаў кандыдат ад кіруючай партыі «Саюз за народны рух» Нікаля Сарказі (31,18 працэнта).

За ім ідзе прадстаўніца апазіцыйнай Сацыялістычнай партыі Сегален Руаяль з 25,87 працэнта галасоў. Такім чынам у Францыі ўзнікла неабходнасць у правядзенні другога тура выбараў. Ён прызначаны на 6 мая.

Пры ўмове таго, што прэзідэнцкае крэсла рэспублікі зойме менавіта Сарказі, вектар знешняй палітыкі Францыі можа быць крыху адкарэктаваны. Найбольш верагодны будучы прэзідэнт на днях абвясціў, што Злучаныя Штаты Амерыкі яму нашмат больш сімпатычныя, чым Расія. «Калі вы хочаце, каб я сказаў, да каго я бліжэй — да ЗША ці да Расіі, якая паводзіць сябе так, як мы гэта бачылі ў Чачні, то я бліжэй да ЗША», — заявіў Сарказі. «Я гавару вялікім дзяржавам, у прыватнасці ЗША, пра тое, што яны робяць памылку, калі не падпісваюць Кіёцкі пратакол, што яны не справядлівыя ў Іраку. Але ў нас агульныя каштоўнасці — гэта вялікая дэмакратыя», — запэўніў Сарказі.

Апошні з еўрапейскіх сяброў прэзідэнта РФ Уладзіміра Пуціна — прэзідэнт Францыі Жак Шырак — пакіне сваю пасаду 16 мая 2007 года.

ЮШЧАНКА І ЯНУКОВІЧ СУСТРЭЛІСЯ Ў СЁМЫ РАЗ

Пра гэта ўчора паведаміла прэс-служба прэзідэнта Украіны. Сустрэча адбылася 23 красавіка ў 10.00 па мясцовым часе і працягвалася дзве гадзіны. Учора бакі не далі каментарыяў па яе выніках.

Напярэдадні сустрэчы Віктар Януковіч у прамым эфіры расійскага тэлебачання прапанаваў Юшчанку дамовіцца раней за паразу ў Канстытуцыйным Судзе. Тым часам у Цэнтральнай выбарчай камісіі Украіны прызналі датэрміновыя выбары ў Раду, намечаныя на 27 мая, сарванымі. З такой заявай выступіла намеснік Цэнтрвыбаркама Украіны Марына Стаўнійчук.

У фонд суботніка — 11,3 мільярда рублёў

Рэспубліканскі суботнік у гэтым годзе прайшоў вынікова, а заробленыя на ім сродкі плануецца накіраваць на сацыяльную падтрымку беларускіх дзетак.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Апараце Савета Міністраў Беларусі, у рэспубліканскім суботніку 21 красавіка прынялі ўдзел больш за 3595,6 тысячы чалавек. У фонд суботніка было пералічана больш за 11,3 мільярда рублёў. Прадпрыемствы і арганізацыі краіны вырабілі прамысловай прадукцыі ў бягучых цэнах больш як на 16,7 мільярда рублёў.

Найбольшая колькасць людзей, што былі задзейнічаны ў суботніку, зарэгістравана ў сталіцы, дзе ў мерапрыемстве прынялі ўдзел амаль 683,9 тысячы чалавек. У Віцебскай вобласці ўдзельнічалі у суботніку 583,7 тысячы чалавек, Мінскай — 452,7 тысячы, Брэсцкай — 457,9 тысячы, Гродзенскай — 416,6 тысячы, Магілёўскай — 433 тысячы, Гомельскай — 567,9 тысячы чалавек. Мінчане пералічылі ў фонд суботніка 4500 мільёнаў рублёў, з Брэсцкай вобласці паступіла 1055,8 мільёна рублёў, Віцебскай — 1250 мільёнаў, Гомельскай — 1740 мільёнаў, Гродзенскай — 863,7 мільёна, Мінскай — 888,1 мільёна, Магілёўскай — 992,2 мільёна рублёў. Прадпрыемствы і арганізацыі сталіцы выпусцілі прадукцыі амаль на 5492,9 мільёна рублёў, Брэсцкай вобласці — на 1511,7 мільёна, Віцебскай — на 1820,5 мільёна, Гомельскай — на 1510 мільёнаў, Гродзенскай — на 1501,7 мільёна, Мінскай — на 2485,9 мільёна, Магілёўскай — на 2401,7 мільёна рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Санаторно-курортное унитарное предприятие «Белагроздравница» БелАПС (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования филиала «Детский санаторий «Дружба» в районе поселка Городище Минского района (далее—объект). Продаже подлежат: административное здание (84,9 кв.м), лечебный корпус (304,9 кв.м), спальный корпус № 1 (207,9 кв.м), спальный корпус № 2 (409,0 кв.м), спальный корпус № 3 (214,1 кв.м), спальный корпус № 4 (143,0 кв.м), столовая (1956,2 кв.м), веранда 61,9, водолечебница (75,5 кв.м), склад (25,1 кв.м), котельная (500,9 кв.м), ангар (559,1 кв.м), гараж (312,2 кв.м), пристройка к гаражу (82,9 кв.м), артезианские скважины питьевой и минеральной воды, ограждения, емкости. Площадь земельного участка 10,73 га. Начальная цена 2 200 700 000 рублей включая НДС.

Размер задатка составляет 5% от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено местной землеустроительной и геодезической службой. Покупатель объекта обязан выполнить следующие условия:

- переоформить акт землепользования;
- соорудить забор по границе земельного участка между покупателем и общежитием филиала «Детский санаторий «Дружба»;
- обеспечить жильцов общежития филиала «Детский санаторий «Дружба» жизненно необходимыми условиями проживания (отоплением, электроэнергией, водоснабжением и канализацией) на условиях договора между покупателем и УП «Белагроздравница» БелАПС.

Оплата за объект производится в соответствии с договором купли-продажи. Аукцион состоится 16 мая 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 15 мая 2007 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН: (8-017) 227-40-22.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПРОВОДИТ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ ПО ПРОДАЖЕ:

- изолированных помещений, расположенных по адресу: Солигорский район, Метявичское шоссе, 5 общ. пл. 2586,1, 268,1 и 1291,5 кв.м. Нач. цены с НДС соответственно составляют 1 002 492 711, 82 455 124 и 515 205 662 бел. руб.;

- незавершенной строительством летней базы отдыха «Левки», расположенной на берегу озера «Левки» Стародорожского района Минской области, на зем. участке общ. пл. 1,1005 га. Нач. цена с НДС 191 888 462 бел.руб.;

- производственных, складских и административных зданий в г. Копыле и Копыльском р-не д. Тимковичи;

- здания вспомогательного корпуса (общ. пл. 403,5 кв. м), расположенного в г. Марьина Горка, Шацкое шоссе и здания конторы (общ. пл. 258,5 кв. м), расположенного в Пуховичском районе, д. Пуховичи, ул. Садовая, д. 22. Нач. цены соответственно 65 888 000 и 69 044 000 бел.руб.

Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

ЗАБУДОВА

Будущее строится уже сегодня!

Каждый раз, когда приходит весна, и в городе становится немного неуютно, вспоминаешь свою давнюю мечту — построить дом... Сейчас самое удачное время, чтобы эту мечту осуществить!

С чего начать? Со звонка в ОАО «Забудова»! Потому что это уникальный на территории СНГ домостроительный комбинат, выпускающий ПОЛНЫЙ КОМПЛЕКТ материалов и конструкций для дома: изделия из ячеистого бетона, деревянные евроокна и двери, погонажные изделия, сухие строительные смеси, гидратную известь, высокопрочный гипс. То есть, все, что необходимо для создания дома вашей мечты, начиная от прочной, не требующей ухода, практически не изнашиваемой тротуарной плитки на садовой дорожке до экономичной, экологичной, идеально защищающей от капризов погоды, цементно-песчаной черепицы на крыше.

ОАО «Забудова» — крупнейшее предприятие белорусской отрасли промышленности строительных материалов, с солидным опытом работы и серьезной репутацией. Подтверждение этому — множество востребованных строительных изделий и конструкций, которые активно используются при возведении энергоэффективных домов не только в Беларуси, но и в ближнем зарубежье.

Не откладывайте осуществление вашей мечты — будущее строится уже сегодня!

Тел.: 8(01773) 90348, 90209, 90320, 99235, 8(029) 703-52-79 www.zabudova.by

ISSN 1990-763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.04.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 145,00
1 еўра	2 909,37
1 латвійскі лат	4 144,53
1 літоўскі літ	842,61
1 чэшская крона	103,80
1 польскі злоты	769,85
1 расійскі рубель	83,26
1 украінская грыўня	426,02

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	25,7617
10 UAH	50,8873
1000 BYR	11,9906
EUR	34,9844

Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.04.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Ладпільцуем на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Годовой баланс

ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» за 2006 год

220013 г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, тел. 202-00-89, 285-76-22

Лицензия № 02200/0060572, 26.03.04 г. — 26.03.09 г., выд. МФ РБ

млн. руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	11 107,9	**Источники собственных средств, всего**	10 096,1
Нематериальные активы	0,1	в том числе:	
Финансовые вложения, всего	3 337,7	уставный фонд	4 556,2
в том числе:		резервный фонд	634,8
инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	1 329,2
инвестиции в другие организации	1 267,1	фонд накопления	2 663,1
облигации и другие долговые обязательства	-	фонд потребления	245,3
Прочие финансовые вложения	2 070,6	целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	1 777,9	Нераспределенная прибыль прошлых лет	219,9
		Нераспределенная прибыль отчетного периода	447,6
Дебиторы, всего	24 314,2	**Страховые резервы и фонды, всего**	33 499,9
В том числе:		в том числе:	
Дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	39,4	страховые резервы	30 539,5
		Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	2 960,4
Депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	Гарантийные фонды	-
		Кредиторы, всего	11 940,7
Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	24 274,8	в том числе: Кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	277,6
Прочие активы, всего	16 862,5		
В том числе:		Кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
Незавершенное строительство	1 041,2		
Материальные ценности и затраты	531,5	Депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
Денежные средства	15 289,8		
Собственные акции (доли)	-	заемные средства	8 393,6
прочие активы	-	Кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	3 269,5
Непокрытые убытки прошлых лет	-		
Непокрытые убытки отчетного года	-	**Прочие пассивы**	1 863,6
БАЛАНС	57 400,3	**БАЛАНС**	57 400,3

Отчет о финансовых результатах

ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» за 2006 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменения резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела, связанные с заключением договоров страхования жизни	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	45 656,5
Изменения резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -)	067	- 4 595,6
Оплаченные убытки (страховые выплаты), — нетто перестрахование (+ или -)	082	24 484,8
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	- 6 050,4
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение других страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	2 299,0
Расходы на ведение дела	120	6 683,0
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	25,8
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	320,1
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	1 249,4
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	1 739,1
Операционные расходы	145	481,6
Внереализационные доходы	150	757,1
Внереализационные расходы	155	122,2
Финансовый результат		3 141,8
Использовано прибыли		2 694,2
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	447,6

Отчет подтверждаю аудитор-предприниматель Волчкова А.К. (лицензия на осуществление аудиторской деятельности № 02200/0061832 от 15.02.2006 г. выдана Министерством финансов РБ, квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.03 г., выдан Министерством финансов РБ).

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
по бухгалтерской (финансовой) отчетности
с выражением безусловно положительного аудиторского мнения

«20» февраля 2007 г. **г. Минск**

Генеральному директору ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» Меднику Борису Бениаминовичу

Аудируемое лицо:
Открытое акционерное страховое общество «Би энд Би иншуренс Ко»;
220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38.

Зарегистрировано в Комстрахнадзоре при Минфине РБ, едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, УНН 101063229, в качестве налогоплательщика зарегистрировано в Первомайской ИМНС г. Минска.

Аудиторская организация:
Индивидуальный предприниматель Волчкова Алина Константиновна.
Местонахождение: г. Минск, ул. Жилуновича, д. 37, кв. 47;
УНН: 100961335, свидетельство № 0067877 от 4.03.2002 г. выдано администрацией Заводского района г. Минска, специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0061832 от 15.02.06, выданное Министерством финансов РБ; квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.2003 года выданный Министерством финансов РБ.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» за период с 1 января по 31 декабря 2006 г. включительно. Бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» состоит из:
бухгалтерского баланса;
отчета о финансовых результатах;
приложений, предусмотренных нормативными правовыми актами;
пояснительной записки;
расчета чистых активов.

Ответственность за подготовку и представление названной бухгалтерской (финансовой) отчетности несет руководство ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко». Наша обязанность заключается в том, чтобы на основе проведенного аудита выразить мнение о достоверности данной отчетности во всех существенных отношениях и соответствии порядка ведения бухгалтерского учета законодательству Республики Беларусь.

Мы провели аудит в соответствии с:
Законом Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 8 ноября 1994 г. № 3373-XII, в редакции Закона от 18 декабря 2002 г. № 164-З;
республиканскими правилами аудиторской деятельности утвержденными постановлениями Министерства финансов РБ;
нормативными правовыми актами, регулирующими отдельные виды деятельности аудируемого лица: исходя из Закона РБ «О бухгалтерском учете и отчетности», Закона «О бюджете РБ на 2006 г.», «Основные положения по составу затрат, включаемых в себестоимость продукции (работ, услуг)» от 11.02.1998 г. № 2293/12 с последующими дополнениями и изменениями, Положения «О страховой деятельности в Республике Беларусь», утвержденного Декретом Президента РБ от 20.09.2000 г. № 20 «О совершенствовании регулирования страховой деятельности в РБ», Указа Президента РБ от 25.08.06 г. № 530 «О страховой деятельности», а также других нормативных актов, регулирующих финансово-хозяйственную деятельность страхового общества.

Аудит планировался и проводился таким образом, чтобы получить достаточную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений. Аудит проводился выборочным порядком и включал в себя изучение доказательств, подтверждающих значение и раскрытие в бухгалтерской (финансовой) отчетности информации о финансово-хозяйственной деятельности ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», оценку принципов и методов бухгалтерского учета, порядка подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности, определение и анализ существенных оценочных значений, применяемых ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко».

Мы полагаем, что проведенный аудит дает достаточные основания для выражения аудиторского мнения о достоверности во всех существенных отношениях бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» и соответствии совершенных им финансовых (хозяйственных) операций законодательству Республики Беларусь.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 г. и результата финансово-хозяйственной деятельности за 2006 г.

Аудитор — индивидуальный предприниматель Волчкова А.

Шайбу, шайбу!

Вызваляюць абаронцы

Не толькі напружаныя трэніроўкі, але і выкарыстанне арыгінальных тактык (карпаратыўныя сустрэчы з гульнёй у пэйнтбол, наведванне цырка, каб паспрабаваць сябе ў ролі клоўна, жанглёра, паветранага гімнаста і г. д.) дапамаглі беларускім ігракам стаць сапраўднай камандай. У рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету нацыянальная зборная нашай краіны правяла ўжо пяць паядынкаў і ва ўсіх святкавала перамогу.

Фота БЕЛТА.

Два апошнія таварыскія матчы прайшлі ў Беларусі супраць нарвежцаў. У Мінску гаспадары выйгралі з лікам 3:1 (у складзе беларусаў вызначыліся Алег Лявонцьеў і двойчы Дзмітрый Дудзік), у Жлобіне — 5:4 (шайбы закінулі Алег Лявонцьеў, Андрэй Глебаў, Аляксей Угараў, Дзмітрый Дудзік і Аляксандр Журык). У сталіцы сапернікі выглядалі не так упэўнена, як у Жлобіне. Магчыма, таму, што не змаглі правесці раскатку перад матчам у Мінску з-за ... спазнення багажу, які затрымаўся ў Даніі. А вось у Жлобіне госці паказалі, на што вартыя: уступаючы гаспадарам, яны змаглі зраўняць лік да 4:4, і толькі на апошняй хвіліне матча вывесці нашу зборную наперад здолеў абаронца Аляксандр Журык. Дарэчы, у адсутнасць траўмаваных нападаючых Аляксея Страхава, Яраслава Чупрыса і Дзмітрыя Мялешкі менавіта беларускія абаронцы прыходзяць на дапамогу нацыянальнай камандзе. «Добрым урокам» назваў Курт Фрэйзер апошнія пяць хвілін паядынку ў Жлобіне: «Нельга расслабляцца, трэба захоўваць максімальную канцэнтрацыю да фінальнай сірэны, нягледзячы на лік». Сёння беларусы згуляюць са славакамі ў Кошыцэ.

«Сіняя птушка» прынесла поспех беларусам

У канцы гэтага тыдня беларуская зборная толькі выйдзе на расійскі лёд на чэмпіянаце свету, а хакейная каманда Прэзідэнта Беларусі пабывала ўжо ў нашых усходніх суседзяў і стала пераможцай двух таварыскіх матчаў. 22 красавіка на арэне «Сіняя птушка» беларусы выйгралі ў каманды мэрыі Масквы (4:3), а днём раней — у каманды прэфектуры Паўночна-Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы (5:2). Кіраўнік нашай краіны і яшчэ пяць моцных ігракоў не змаглі ўзяць удзел у сустрэчах.

Ірына ПРЫМАК.

АД РЭАЛІЙ ЖЫЦЦЯ — ДА НОРМАЎ ЗАКОНАЎ

Эксклюзіўнае інтэрв'ю «Звяздзе» намесніка Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Сяргея ЗАБАЛОТЦА

— Мяркуючы па колькасці законапраектаў, разгледжаных дэпутатамі на першых пленарных пасяджэннях вясновай сесіі (больш за 30), заканатворчая работа спорыцца. Чым вы патлумачыце, Сяргей Макаравіч, такую даволі шпаркую «прапускную здольнасць» Палаты прадстаўнікоў?

— Належнай арганізацыйнай і змястоўнай падрыхтаванасцю да сесіі. Па законапраектах, якія абмяркоўваюцца ў Авальнай зале, у дэпутатаў ужо сфарміравалася пазіцыя, таму з прыняццем салідарных рашэнняў асаблівых праблем не ўзнікла.

— Аднак без гарачых дыскусій не абышлося. Нямала коп'яў зламана пры абмеркаванні новай працэдуры ўсынаўлення, паўнамоцтваў пракуратуры. Ды і па законапраекту «Аб рэкламе», хоць і прынятым большасцю галасоў, спрэчка таксама была даволі эмацыянальнай...

— Роскід думак, які ўзнікае ў дэпутатаў па рэгулюемых рэзанансных пытаннях, — гэта натуральна. На тое і парламент, каб народныя выбраннікі шчыра выказвалі свае погляды і меркаванні. Тая ж тэма рэкламы, асабліва тэлевізійнай і вонкавай, на слыху не першы год. Яе навязлівасць, а то і проста «адвязанасць», набіла аскоміну, таму нават на стадыі другога чытання некаторыя дэпутаты не адмовіліся ад сваіх радыкальных прапаноў. Але галасаванне паказала, што нам удалося выпрацаваць рашэнне, у якім збалансаваны інтарэсы рэкламнага рынку як важнага сектара эканомікі і спажыўцоў рэкламы. Для гэтага дэпутаты напружана папрацавалі разам з Саветам Міністраў, Адміністрацыяй Прэзідэнта, экспертамі, спецыялістамі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў і грамадскасцю. У выніку калектыўнай шліфоўкі законапраекта быў сістэматызаваны ўвесь спектр адносінаў у рэкламнай сферы, прычым уліканы і эканамічны, і маральна-псіхалагічны фактар. Забаронена рэклама, якая абуджае агрэсію і іншыя небяспечныя дзеянні, устаноўлены абмежаванні на рэкламу піва, алкаголю і табачных вырабаў, а таксама акрэслены рамкі для рэкламы медыцынскага характару і рэкламы ў сродках масавай інфармацыі. Атрымаўся, лічу, узважаны дакумент, які пасля ўступлення ў сілу паслужыць як эканамічным, так і грамадскім інтарэсам.

— І што пры ацэнцы дэпутатамі новых заканадаўчых ініцыятыў з'яўляецца вызначальным?

— Адпаведнасць рэаліям нашага беларускага жыцця. Можна красамоўна выказвацца па актуальных пытаннях, разумна тэарэтызаваць, прыводзіць выкладкі, але карысці будзе мала, калі прававыя нормы не прывязаны як след да становішча спраў у рэгулюемай сферы. Правілы паводзінаў, якія ўстанаўліваюць законы, жыццядзейныя толькі пры ўмове заснаванасці на тым, што ўжо замацавалася альбо замацоўваецца на практыцы. Менавіта такія правілы мы і ўвасабляем у нацыянальным заканадаўстве.

Узяць, скажам, законапраект «Аб унітарных прадпрыемствах». Дэталёва прапрацоўваючы іх прававы статус, парадак дзейнасці і ліквідацыі, а таксама правы і абавязкі ўласнікаў маёмасці гэтых камерцыйных арганізацый, дэпутаты запрасілі да экспертызы вытворцаў, наймальнікаў, міністэрствы, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, грамадскія аб'яднанні. Быў прааналізаваны практычны вопыт шэрагу ўнітарных прадпрыемстваў, як дзяржаўных, так і прыватных, што дазволіла зверыць пазіцыі і дакладна вызначыцца па канцэптуальных падыходах. Законапраект атрымаў адабрэнне ў першым чытанні і цяпер рыхтуецца да другога чытання.

— Чым кіраваліся дэпутаты, выказаўшыся за ўстанаўленне больш суровай крымінальнай адказнасці за збыт наркотыкаў?

— Зноў жа — правапрымяняльнай практыкай, якая пасведчыла, што наркадзялкам удаецца пазбягаць адэкватнага пакарання за цяжкія злачынствы, таму што яно не залежыць ад небяспечнасці таго ці іншага віду наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў. Гэта зніжае эфектыўнасць барацьбы з распаўсюджваннем у нашай краіне асабліва небяспечных наркотыкаў. Таму ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь уносіцца адпаведнае дапаўненне. Карэктуецца таксама і дзеючы Закон «Аб наркатычных сродках, псіхатропных рэчывах і іх прекурсорах». Будзе ўзмоцнена адказнасць і за незаконны абарот прекурсораў, з перапрацоўкі якіх вырабляюцца наркотыкі. Абцяжарваючай наркатычныя злачынствы абставінай стане збыт дурману на тэрыторыі ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, вайсковых фарміраванняў, у месцах знаходжання пад вартай, а таксама ў час правядзення спартыўных, культурных і іншых масавых мерапрыемстваў. Гэтыя і іншыя прававыя навацыі пераадолелі ўжо этап першага чытання. Думаю, што далейшы разгляд новай заканадаўчай ініцыятывы таксама пройдзе паспяхова.

— Шырокі грамадскі рэзананс атрымаў законапраект аб новых сацыяльных гарантыях па падтрымцы сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей. Калі ён будзе разглядацца на сесіі?

— Сапраўды, змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб дзяржаўнай дапамозе сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» выклікалі ў грамадстве вялікую цікавасць, бо яны дазволяць павысіць дабрабыт многіх сем'яў. Калі парламент ухваліць гэты дакумент, то памер аднаразовай дапамогі пры нараджэнні ў сям'і першынца павялічыцца з 2 да 5 бюджэтаў пражыткавага мінімуму, а пры нараджэнні другога і наступных дзяцей — да 7 бюджэтаў. Акрамя гэтага, з 65 да 80 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму ўзрасце памер штомесячнай дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Абмеркаванне законапраекта ў першым чытанні запланавана на 25 красавіка.

Я хацеў бы звярнуць увагу чытачоў «Звязды» на тое, што тэматыка аховы дзяцінства і мацярынства, умацавання сацыяльнага статуса сям'і з'яўляецца на гэтай сесіі адной з прыярытэтных. На падыходзе да абмеркавання ў Авальнай зале папраўкі ў заканадаўчыя акты аб правах дзіцяці, утрыманні аліментаў на дзяцей і аб дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў сваім мінулагоднім Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу падкрэсліў неабходнасць прыняцця самых строгіх заканадаўчых мераў, каб у нашай краіне не было сіроцтва пры жывых бацьках. На вырашэнне гэтай задачы і скіраваны названыя законапраекты.

— Раскажыце, Сяргей Макаравіч, па магчымасці канспектыўна, што зроблена па выкананню іншых заканатворчых задач, якія Прэзідэнт паставіў у леташнім Пасланні.

— Перш-наперш мы засяродзіліся на стварэнні прававой базы пад усе стратэгічныя прыярытэты развіцця краіны, вызначаныя трэцім Усебеларускім народным сходам. Прыняты законы па шырокаму спектру эканамічных пытанняў, якія маюць вялікае значэнне для дзяржавы і грамадства. У іх ліку — новыя рэдакцыі Банкаўскага і Мытнага кодэксаў, Паветраны кодэкс, адобраныя ў першым чытанні праект новага Кодэкса аб зямлі і закона аб іпатэцы, які пашырыць магчымасці грамадзян у паляпшэнні сваіх жыллёвых умоў, папраўкі ў заканадаўства аб узмацненні адказнасці за парушэнні ў долевым будаўніцтве шматкватэрных дамоў, дапаўненні і змяненні ў некаторыя законы па пытаннях падаткаабкладання, замацаванне статуса канцэрнаў, вытворчых, навукова-вытворчых і іншых аб'яднанняў.

Праведзена своеасаблівая рэвізія заканадаўства на прадмет яго адпаведнасці патрабаванням кіраўніка дзяржавы па дэбюракратызацыі. Парламентарыі ўрэгулявалі нарматыўную базу натарыяльнай дзейнасці па прынцыпу «аднаго акна». Адменены ўстарэлыя прававыя нормы, якія выклікалі ў людзей абгрунтаваныя нараканні. Шэраг новых, узаемазвязаных прававых рашэнняў прынята па ўдасканаленню работы з грамадзянамі.

Сістэматызуецца заканадаўства нацыянальнай бяспекі, аховы правапарадку і барацьбы з арганізаванай злачыннасцю. Створаны прававы падмурак процідзеяння карупцыі, экстрэмізму, грамадзянскай абароны, ахоўнай дзейнасці. Нядаўна мы адобрылі ў другім чытанні законапраект «Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь». Завяршаецца прапрацоўка да другога чытання новых заканадаўчых ініцыятыў аб органах унутраных спраў, аб Дзяржаўнай граніцы і блока законапраектаў па пытаннях ваеннага будаўніцтва.

У сацыяльным пакеце прынятых нарматыўных дакументаў я выдзелю бы прававую рэгламентацыю агульнай сярэдняй адукацыі, шэрагу пытанняў сацыяльнай абароны сям'і, занятасці насельніцтва, сацыяльных гарантый дзецям-інвалідам, комплекснае ўрэгуляванне адносінаў у сферы абарачэння лекавых сродкаў, а таксама ўмацаванне страхавых прынцыпаў у пенсійнай сістэме. На гэтай сесіі разгледзім яшчэ некалькі рэзанансных законапраектаў — «Аб вышэйшай адукацыі», «Аб прафесійным пенсійным страхаванні», «Аб ахове працы» і папраўкі ў закон «Аб ахове здароўя».

Усе прынятыя прававыя дакументы і тыя, што будуць адобраны на вясновай сесіі, здольны, я ўпэўнены, істотна паўплываць на паляпшэнне якасці жыцця ў нашай краіне і сыграюць сваю стваральную, стымулюючую ролю ў пабудове дзяржавы для народа.

— Важнейшай палітычнай падзеяй гэтай сесіі стане зварот кіраўніка дзяржавы ў Авальнай зале парламента з чарговым Пасланнем беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. На якіх пытаннях, на ваш погляд, зробіць акцэнт Прэзідэнт?

— У заканатворчасці вельмі многае залежыць ад тонусу дыялога парламентарыяў з Прэзідэнтам. Я хацеў бы падкрэсліць, што гэты дыялог канструктыўны і плённы. Ён уключае рэгулярныя сустрэчы дэпутатаў з кіраўніком дзяржавы, абмен думкамі па актуальных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны і заканадаўчай дзейнасці. Штогадовыя звароты Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу заўсёды даюць падставу для роздуму, заражаюць нас новымі ідэямі. Мяркую, што і ў чарговым Пасланні Прэзідэнт з характэрнай яму шчырасцю выкажацца па ключавых праблемах развіцця Беларусі. Ён акрэсліць галоўныя напрамкі прыкладання сіл усіх галін дзяржаўнай улады для замацавання ўстойлівага эканамічнага росту, забеспячэння высокіх якасных параметраў рэальнага сектара эканомікі з мэтай павышэння канкурэнтаздольнасці краіны. Адной з цэнтральных будзе, на мой погляд, тэма энергетычнай бяспекі.

Кіраўнік дзяржавы, мяркую, удзеліць значную ўвагу пытанням дзейнасці структур дзяржаўнага кіравання, рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сацыяльнай сферы, у тым ліку ў кантэксце пашырэння адраснай сацыяльнай дапамогі. Шырока прагучыць, як уяўляецца, тэма міжнародных адносінаў, узаемадзеяння з нашымі асноўнымі міжнароднымі партнёрамі — Расійскай Федэрацыяй, краінамі СНД, а таксама з суседнімі дзяржавамі і Еўрапейскім саюзам. Канкрэтныя заканатворчыя задачы Прэзідэнт вызначыць для парламентарыяў.

Не сумняваюся, што Пасланне выкліча вялікую цікавасць не толькі ў дэпутатаў і чыноўнікаў, бо яно, як і папярэднія штогадовыя пасланні, будзе звернута да кожнага грамадзяніна нашай краіны, падахвоціць усіх нас да актыўнай працы па рэалізацыі актуальных задач і аб'яднальных ідэй, якія прагучаць з вуснаў беларускага лідара.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

Прамая лінія

Спачувайце вачам — насіце акуляры

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Блізарукасць слабай ступені — -3, -4 дыёптрыі — лічыцца ўжо нават больш нармальнай з'явай, чым вока-«адзінка». Тлумачыцца гэта пераходам чалавецтва да работы на блізкай адлегласці. Па сутнасці, міяпія слабай ступені — гэта не столькі хвароба, колькі адаптацыйны механізм, які спрацаваў у выніку эвалюцыі. Аднак спецыялістаў хвалюе няўхільны рост выпадкаў блізарукасці высокіх ступеняў, калі з'яўляюцца пэўныя ўскладненні — змяненні ў сятчатцы.

Зараз 75 працэнтаў беларускіх школьнікаў — блізарукія. І кожнаму трэба дапамагчы захаваць зрок, не дапусціць яго пагаршэння. А для гэтага перш-наперш іх бацькі павінны ведаць некалькі важных рэчаў.

Фарміраванне зроку, скаардынаваний узаемасувязі паміж вачамі адбываецца ў дзіцяці ва ўзросце дзесьці ад 3 да 6 месяцаў. Да 3 гадоў могуць закладвацца «асновы» касавокасці або амбліяпіі — знікненне вастрыні зроку на неўстаноўленай прычыне. Афтальмолагі лічаць магчымым змагацца з той жа амбліяпіяй да 10—12 гадоў, аднак варта памятаць, што першы візіт да ўрача такога дзіцяці ў 6-гадовым узросце ўказвае на ўпушчаны час, а значыць, не абяцае станоўчага выніку. Такім чынам, першая «важная рэч» заключаецца ў неабходнасці своечасовага і рэгулярнага — 1—2 разы на год — наведвання афтальмолага. Усё астатняе — гэта простыя правілы (і для дзяцей, і для дарослых): вытрымлівайце аптычныя нагрузкі, сачыце за тым, каб у становішчы седзячы галава за сталом не апускалася ніжэй 30 сантыметраў. Развіццё блізарукасці стымулюе, як вядома, разглядванне прадметаў зблізку. Святло павінна асвятляць рабочую паверхню злева — для праўшэй і справа — для ляўшэй. Патрэбна не толькі лямпа на стале, але і добрае агульнае асвятленне памяшкання. Абавязкова трэба рабіць перапынкі ў рабоце, праводзіць вочы на іншыя прадметы. І яшчэ. Здаровым вачам, як, дарэчы, і ўсім іншым органам ці сістэмам, патрэбны... у цэлым здаровы арганізм — вітаміны, заняткі фізкультурай, добры настрой.

Падрабязней пра тое, як прадухіліць «свабоднае падзенне» зроку, чытайце ў «прамой лініі», адказы падчас якой давала кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры афтальмалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Галіна СЯМАК.

☎ — Добры дзень! Тэлефаную з Дзяржынска. Мяне завуць Вера Аляксандраўна. У мяне знайшлі на левым воку катаракту. Пакуль пра аперацыю нічога не гавораць. Але бачу дрэнна, тым больш што на правым воку таксама пачынаецца катаракта. Кансультавалася ў платным медыцынскім цэнтры, там выпісалі кроплі вітадэнт, катахран — не дапамагаюць. Ці можна лячыць катаракту нечым іншым, хоць бы правае вока? Чула, што можна выдаліць катаракту лазерам. Ці так гэта?

— Паважаная Вера Аляксандраўна, лазерам катаракту не лечаць. Да таго ж на сёння ніякія медыкаментозныя сродкі не могуць рассмактаць памутненне ў хрусталіку. Катаракта лечыцца хірургічным шляхам, і для гэтага існуе вялікая колькасць добрых методык. Напрыклад, метад факаэмульсіфікацыі, калі пры дапамозе ўльтрагуку дробяць гэту памутнелую катаракту, адсмоктваюць яе з вока і замяняюць яе на штучную лінзу. Такі метад выкарыстоўваюць у 3-й і 10-й клініках горада Мінска. Пры гэтым не трэба чакаць саспелай катаракты. Адзінае — бываюць проціпаказанні агульнага характару або мяркуемы зрок плануецца не вельмі высокім з-за нейкіх ускладненняў. Але, каб гэта вызначыць, вас павінен агледзець лечачы доктар. Ён і павінен вырашыць: ці дастаткова зараз кансерватыўнага лячэння. Аднак хачу сказаць, што вялікіх вынікаў яно не прыносіць. Паверце мне, калі б вітамінамі і кроплямі можна было рассмактаць катаракту, то ніхто б яе не аперыраваў. А мы штодзень аперыруем каля 20 чалавек з гэтым дыягназам.

«Прамую лінію» вялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» тэлефоннай лініі Міністэрства аховы (222-70-80) будуць:

24 красавіка — вядучы спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Віктараўна ВАРАПАЕВА.

25 красавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Іванавіч СЯДЫХ.

26 красавіка — намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы радзільнага дома Мінскай вобласці Тамара Канстанцінаўна АЛЯКСАНДРАВА.

27 красавіка — начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Ірына Уладзіміраўна МІТРАШЭНКА.

У графіку магчымыя змяненні.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводит открытый аукцион

по продаже гаражей, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 91:

Номер лота	Номер гаража	кв.м	Начальная цена с НДС
1	1 Б (с ямой)	28,3	18400 000
2	2 Б (с ямой)	20,3	13710 000
3	3 Б	16,5	11510 000
4	4 Б (с ямой)	16,3	12700 000
5	5 Б	16,7	11550 000
6	6 Б	16,6	11530 000
7	7 Б	16,4	11410 000
8	8 Б	15,7	11250 000
9	9 Б	16,6	11610 000

Размер задатка 10% от начальной цены лота и перечисляется на р/с №30 12020200010 в Октябрьском отделении ОАО «Белпромстройбанк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 дней после проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **17 мая 2007 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16 мая 2007** года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 322.

Телефон (8017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «УНИВЕРСАМ ФРУНЗЕНСКИЙ»
220092 г. Минск, пр. Пушкина, 37 Т/ф. 251-01-74

Руководитель: Рубан Владимир Андреевич
Гл. бухгалтер: Пукач Нина Николаевна
Основные виды деятельности: розничная торговля

Единица измерения млн. руб.

Бухгалтерский баланс на 1 января 2007 года

АКТИВ	Код стр.	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Основные средства (01, 02)	110	3164
Нематериальные активы (04, 05)	120	-
Доходные вложения в материальные ценности (02, 03)	130	-
Вложения во внеоборотные активы (07, 08, 16, 60)	140	76
Прочие внеоборотные активы	150	-
ИТОГО по разделу I	190	3240
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Запасы и затраты	210	88
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	114
Готовая продукция и товары(40, 41, 43)	230	600
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	240	-
Дебиторская задолженность	250	27
Финансовые вложения (58, 59)	260	-
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	270	2116
Прочие оборотные активы	280	-
ИТОГО по разделу II	290	2945
ПАССИВ		
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ		
Уставный фонд (80)	510	256
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	515	-
Резервный фонд (82)	520	108
Добавочный фонд (83)	530	3474
Нераспределенная прибыль (84)	540	206
Непокрытый убыток (84)	550	-
Целевое финансирование (86)	560	-
ИТОГО по разделу III	590	4044
IV. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Резервы предстоящих расходов (96)	610	1
Расходы будущих периодов (97)	620	-12
Доходы будущих периодов (98)	630	-
Прибыль отчетного года (99)	640	-
Убыток отчетного года (99)	650	-
Прочие доходы и расходы	660	-
ИТОГО по разделу IV	690	-11
V. РАСЧЕТЫ		
Краткосрочные кредиты и займы (66)	710	-
Долгосрочные кредиты и займы (67)	720	-
Кредиторская задолженность	730	2152
Прочие виды обязательств	740	-
ИТОГО по разделу V	790	2152

Отчет о прибылях и убытках

Наименование показателя	Код стр.	На конец отчетного периода
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	010	16922
в том числе: бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах и тарифах	011	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	020	14371
Управленческие расходы	030	-
Расходы на реализацию	040	2128
Прибыль (убыток) от реализации (010—020—030—040)	050	423
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Доходы от операций с имуществом	060	-
Расходы от операций с имуществом	070	-
Доходы от финансовых операций	080	-
Расходы от финансовых операций	090	-
Прочие операционные доходы	100	138
Прочие операционные расходы	110	11
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (060—070+080—090+100—110)	120	127
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	130	8
Внереализационные расходы	140	179
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (130—140)	150	-172
ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД (050+120+150)	160	378
Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	170	185
НЕРАСПРЕДЕЛЕННАЯ ПРИБЫЛЬ (НЕПОКРЫТЫЙ УБЫТОК) (160—170)	180	193
НЕРАСПРЕДЕЛЕННАЯ ПРИБЫЛЬ (НЕПОКРЫТЫЙ УБЫТОК) (161—171)		

Данные отчетности подтверждены ООО «Партнераудит». Лицензия Министерства финансов РБ № 02200/0061719, срок действия до 11 марта 2009 г.

ОАО «Белгипс» г. Минск, ул. Козлова, 24

Бухгалтерский баланс за 2006 год по состоянию на 01.01.2007 г.

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
Актив			
Внеоборотные активы	190	5305	6684
Оборотные активы	290	1962	3027
Баланс	390	7267	9711
Пассив			
3. источники собственных средств	590	6006	7083
4. доходы и расходы	690	-28	-29
5. расчеты	790	1289	2657
Баланс	890	7267	9711

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2006 ГОД

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	На начало года	На конец года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	14143	18279
Налоги и сборы	020	1498	1634
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	11674	15301
Расходы на реализацию	060	119	148
Прибыль от реализации	070	852	1196
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	130	-12	-4
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	190	-215	-343
Прибыль (убыток) за отчетный период	200	625	849
Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	210	311	393
Прибыль (убыток) к распределению	240	314	454

ПУНКТЫ 5—10 ФОРМЫ 1 «ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ»

5. Количество акционеров — всего 181, в том числе юридических лиц 2, физических лиц 179.
6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	40,7	29,4
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	63,7	46,02
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	11,07	9,3
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	-	-

7. Информация о задолженности:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	18	5
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	20	20

8. Отдельные финансовые результаты страховых организаций:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных обязательных платежей)	миллионов рублей	16645	12645
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг; управленческие расходы; расходы на реализацию	миллионов рублей	15449	11793

9. Среднесписочная численность работающих (человек) 275.
10. Основные виды продукции или виды деятельности: производство гипсовых изделий.

Директор А.А. Бобовников
Главный бухгалтер С.Н. Мисюра

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «ЧЕРНАВЧИЦКИЙ ЗАВОД ЖЕЛЕЗОБЕТОННЫХ ИЗДЕЛИЙ» ЗА 2006 ГОД

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 01.01.2007 ГОДА

млн. руб.

АКТИВ	На начало отчетного года	На конец отчетного года
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Основные средства (01, 02)	643	783
Нематериальные активы (04, 05)	2	1
Вложения во внеоборотные активы (07, 08, 16, 60)	13	14
ИТОГО по разделу I	658	798
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Запасы и затраты	203	319
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	2	2
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	64	35
Дебиторская задолженность	75	163
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	53	38
ИТОГО по разделу II	397	557
БАЛАНС	1 055	1 355
ПАССИВ	**На начало отчетного года**	**На конец отчетного года**
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ		
Уставный фонд (80)	167	167
Резервный фонд (82)	8	14
Добавочный фонд (83)	603	754
Нераспределенная прибыль (84)	155	232
ИТОГО по разделу III	933	1 167
IV. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Расходы будущих периодов (97)	-3	-4
ИТОГО по разделу IV	-3	-4
V. РАСЧЕТЫ		
Кредиторская задолженность (66)	125	192
ИТОГО по разделу V	125	192
БАЛАНС	**1 055**	**1 355**

ФОРМА № 1 «ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОТКРЫТОМ АКЦИОНЕРНОМ ОБЩЕСТВЕ И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ» ПО СОСТОЯНИЮ НА 01 ЯНВАРЯ 2007 Г.

Количество акционеров — всего 130, в том числе юридических лиц — 1, физических лиц — 129.
Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период (2005 г.)	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб.	3	4
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	94	120
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	34,9	28

Информация о задолженности:

Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	млн. руб.	38	27
Просроченная кредиторская задолженность	млн. руб.	15	11

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2006 ГОД

(млн. руб.)

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	3207	2431
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	576	457
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	030	2631	1974
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	2477	1884
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	070	154	90
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Операционные доходы	080	8	73
Налоги, включаемые в операционные доходы	090	1	
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (080-090)	100	7	73
Прочие операционные доходы	104	7	
Операционные расходы	110	4	69
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+ -120)	130	3	4
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ Внереализационные доходы	140	1	1
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных платежей) (140-150)	160	1	1
Внереализационные расходы	170	3	-
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170+180)	190	-2	1
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА НЕ ЗАДАВОЛЕНЫ РЭЗУЛЬТАТЫЎНАСЦЮ БЕЛАРУСКАГА ХАКЕЯ

Аб гэтым ён заявіў учора на нарадзе па пытанню ўдзелу беларускай каманды па хакею з шайбай у чэмпіянаце Расіі.

Кіраўнік дзяржавы прызнаў, што міжнародны поспех «Юнацтва», які выйграў у студзені гэтага года Кантынентальны кубак, — новая старонка ў гісторыі беларускага хакея. «Але хто сёння можа гарантаваць добрае выступленне нашай каманды ў Маскве на чэмпіянаце свету?» — задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што маладзёжная і юнацкая зборныя Беларусі «затрымаліся паміж двума паверхамі». «Гэта таптанне на месцы», — ацаніў сітуацыю кіраўнік дзяржавы. На жаль, сказаў ён, аб'ектыўная інфармацыя не дае магчымасці даць упэўнены адказ на пытанне аб якасці і перспектывах нашага хакея.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, ключом вырашэння гэтай праблемы з'яўляецца павышэнне спартыўнага майстэрства беларускіх хакеістаў і баявога духу каманды. Гэтаму трэнеры і федэрацыя хакея павінны ўдзяляць прыярытэтную ўвагу, падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў Беларусі будзе прадоўжана будаўніцтва Лядовых палацаў у гарадах з насельніцтвам каля 100 тыс. Цяпер у рэспубліцы ўзведзена 10 Лядовых палацаў. Ні адзін з іх дзяржава не датуе — яны самакупныя, падкрэсліў Прэзідэнт. «Гэта нармальныя праекты з пункту гледжання эканомікі. Так, мы, напэўна, не вернем у бюджэт грошы — гэта сацыяльныя аб'екты, і не трэба на гэта спадзявацца. Але галоўнае, што мы грошы не тратым на іх утрыманне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у планах — узвядзенне Лядовых палацаў у такіх гарадах, як Баранавічы, Бабруйск, Орша, Ліда, Полацк. «Час ужо зрабіць, як у вядучых дзяржавах свету, — лічыць ён. — У Фінляндыі, Чэхіі — сотні лядовых пляцовак, а ў нас усяго дзесяць». Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што дзяржава траціць вялікія грошы на падтрымку спорту. Толькі на развіццё хакея ў 2006 годзе было эрасходавана амаль Br60 млрд. «Ні адна дзяржава столькі грошай «адкрыта» не ўкладвае», — падкрэсліў беларускі лідар.

Беларуская хакейная каманда не будзе прымаць удзел у чэмпіянаце Расіі. Такое рашэнне было прынята па выніках нарады. У час абмеркавання былі выказаны розныя пункты погляду адносна магчымага ўдзелу Беларусі ў расійскім чэмпіянаце. Аднак, па-сапраўднаму важкіх аргументаў на карысць гэтага кроку прыведзена не было.

Падводзячы вынікі, Прэзідэнт падкрэсліў, што ў бліжэйшы час неабходна засяродзіць намаганні і сродкі на вырашэнні праблем беларускага хакея, павышэння майстэрства ігракоў і кваліфікацыі трэнераў, навучанні маладых аматараў хакея ў спартыўных лагерах за мяжой. «Мы толькі-толькі ўстаём на ногі ў хакеі, нам неабходна падняць наш чэмпіянат да больш высокага ўзроўню», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Крымінал

Махляры трапілі на нары

Двое прайдзісветаў вырашылі падзарабіць на «карупцыйнай ніве».

Паводле звестак пракуратуры, аферысты адшуквалі людзей, якія самі ці іх блізкія мелі непрыемнасці з законам, і прапаноўвалі свае пасрэдніцкія паслугі па вырашэнню праблем. У прыватнасці, гэтыя «дабрадзеі» абяцалі, што дапамогуць зняць арышт з заблакаванага рахунка, спыніць крымінальную справу і нават вызваліць падазронага са следчага ізалятара. Даверлівым ахвярам аферысты тлумачылі, што маюць уплывовых асобаў у праваахоўных органах, якім трэба толькі заплаціць «кругленькую» суму, і ўсе непрыемнасці з законам скончацца. Некаторыя грамадзяне трапілі на гэтую «прынаду» і перадавалі прайдзісветам «выкуп». Сваёй здабычай, а ўсяго махляры такім чынам выцыганілі больш за 30 тысяч долараў, падбухторшчыкі і не думалі ні з кім дзяліцца. Як, зрэшты, не ўваходзіла ў іх планы і вырашэнне праблем сваіх «кліентаў». Гэта ў хуткім часе зразумелі і самі падманутыя «хабарадаўцы» і звярнуліся ў праваахоўныя органы. Махляроў знайшлі і затрымалі. А нядаўна адбыўся суд, які прыгаварыў кожнага прайдзісвета да 3 гадоў і 8 месяцаў пазбаўлення волі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Бабруйчанка не дала абакрасці кватэру суседзяў

На пачатку красавіка ўдзень у дзяжурную часць аддзела ўнутраных спраў Бабруйскага гарвыканкама патэлефанавала жанчына. Яна ўсхвалявана паведаміла, што два невядомыя мужчыны выносяць з суседняй кватэры тэлевізар.

На месца здарэння тэрмінова быў накіраваны аўтамабіль з супрацоўнікамі міліцыі. Тым часам жанчына не клала тэлефонную трубку і паведамляла пра рух невядомых з тэлевізарам, назіраючы за імі са свайго балкона. У выніку яны былі затрыманы.

Выявілася, што два мясцовыя жыхары, узростам 27 і 29 гадоў, нідзе не працавалі, раней былі асуджаны за крадзяжы. Яны падабралі ключы і праніклі ў кватэру. Сярод белага дня зладзеі спрабавалі скрасці тэлевізар «Віцязь» і іншыя рэчы, якія потым знайшлі ў іх кішэнях: электрабрытву, пляшку гарэлкі, туалетную ваду, касметычны тонік, лом срэбра. І ўсё гэта ім бы ўдалося скрасці, калі б не пільнасць суседкі.

— Дзякуючы гэтай жанчыне супрацоўнікам міліцыі ўдалося аператыўна раскрыць злачынства і затрымаць вінаватых, — каментуе старшы інспектар групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Бабруйскага гарадскога аддзела ўнутраных спраў Таццяна Гарбанюк. — Ёй 53 гады, яна працуе медсястрой у гарадской бальніцы. А злачынцы ўбачыла ў дзвярное вочка.

За праяўленую грамадзянскую пазіцыю жанчына заахвочана кіраўніцтвам міліцыі горада Бабруйска грашовай прэміяй.

Ілона ІВАНОВА.

Старанныя ўзломшчыкі

Невядомым зламыснікам давялося добра папацець, каб завалодаць параўнальна невялікай сумай грошай.

Гэтае здарэнне зафіксавана ў Радашковічах. Тут, паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, невядомыя дабраліся да сейфа аддзялення сувязі. Прычым «шлях» іх быў нялёгкім. Напачатку злачынцы ўзламалі ўваходныя дзверы, пасля чаго «расправіліся» з навяснымі замкамі на металічных кратах. Затым крымінальнікам давялося ламаць сценку паміж падсобным пакоем і кладоўкай, каб дабрацца ў памяшканне, дзе знаходзіўся сейф. Узламаўшы ж апошні, зламыснікі завалодалі 1 мільёнам 683 тысячамі рублёў. Па гэтаму факту ўзбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

«Мы любім сваіх кліентаў. І рады, што цяпер можам абслугоўваць іх на самым сучасным узроўні»

Для вас

У будні — увагі на гэта амаль не звяртаеш, а вось перад святам… Вочы разбягаюцца — столькі паштовак! Просіш паказаць — адну, потым другую… Цікавіць нешта яшчэ, але ж далей дайматься чалавека неяк няёмка. Таму — купляеш нешта з таго, што ўбачыў. Альбо… не купляеш нічога. У любым выпадку — асадак на душы не з прыемных.

Ведаючы гэта, перад святамі, ва ўсіх гарадах і гарадках пошта стала наладжваць спецыяльныя вялікія кірмашы, а зусім нядаўна ў адным са старэйшых і цэнтральных сталічных аддзяленняў паштовай сувязі адкрыла залу, якая працуе па метаду самаабслугоўвання. Гэта значыць, што вы заходзіце і…

Фота Уладзіміра СЦЯПАНАВА.

Дробязь, але прыемна, за лічаныя секунды, без усялякай чаргі, самі, з дапамогай плацежна-даведачных тэрмінаў па банкаўскай пластыкавай картцы альбо наяўнымі можаце аплаціць камунальныя паслугі, тэлефон, аформіць падпіску, адправіць электронны пераход і інш. Побач, на асобных стэндах — свежыя газеты. А далей — усе віды канвертаў, паштовых набораў, адкрытак (з юбілеем, з вяселлем, з днём нараджэння…), маркі, сувеніры. Усё гэта пакупнік можа патрымаць у руках, разгледзець, прыцаніцца, выбраць. Да таго ж сам з любых лічбавых носьбітаў можа раздрукаваць здымкі — з рамкамі, надпісамі, бардзюрамі, календарамі…

Складана? Гэта на першы погляд. На другі…

Побач з непрывычнымі (пакуль) для многіх тэрміналамі, тым жа фотакіёскам размешчаны, так бы мовіць, падказкі, інструкцыі па карыстанню. Калі ж некаму іх раптам не хопіць — на дапамогу прыйдуць аператары, якія тут працуюць. Яны (была магчымасць убачыць) з гэтай тэхнікай даўно на «ты» і ахвотна дапамагаюць іншым. Тым больш, што ведаюць — дапамога патрэбна толькі спачатку. Потым, як паказвае практыка, кліент ужо сам не захоча «вяртацца да акенца» — нешта аплачваць з дапамогай аператараў. Самому — прасцей, ёсць навыкі. Для многіх «не пытанне» ўжо зрабіць ксеракопію з дакумента, па факсу перадаць патрэбную інфармацыю, выйсці ў Інтэрнэт.

Для гэтага ў зале абсталяваны зручныя рабочыя месцы — садзіся, працуй. Можаш сам раздрукаваць патрэбныя матэрыялы…

А захочаш адпачыць, то зноў жа нікуды ісці не трэба: на месцы можна выпіць кубачак кавы, пагартаць каталогі.

Дарэчы, іх тут таксама падбіралі спецыяльна. Пошта даўно і досыць паспяхова вядзе так званы каталожны гандаль. Гэта значыць, што ў абсалютнай большасці аддзяленняў паштовай сувязі кліент можа замовіць любую рэч з «OTTO», «Schwab», можа пагартаць падпісны каталог… І тут жа аформіць падпіску.

— Мы стараліся зрабіць усё, — гаворыць начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Жанна Васільеўна Шэбека, — каб чалавеку, які зойдзе сюды, было зручна, камфортна. Каб ён мог затрымацца, вырашыць свае праблемы. Да таго ж наша «Сэрвіс-пошта» знаходзіцца пабач са старым горадам, з Востравам слёз, з гасцініцай «Беларусь». Само гэта размяшчэнне прымусіла прадумваць інтэр'ер, падбіраць найноўшую тэхніку. У бліжэйшы час мы плануем устанавіць тут аўтаматы па продажу тавараў, сэрвісных картак…

Для вытворчасці, для РУП «Белпошта» гэта, зразумела ж, нятаннае задавальненне. Але… Чаго не зрабіш для кліента?!

— Зала гэта працуе ўсяго некалькі тыдняў, а водгукаў шмат. І самыя добрыя, — пахвалілася начальнік аддзялення сувязі Антаніна Міхайлаўна Гаўрылычык. — Мы любім сваіх кліентаў і рады, што цяпер зможам абслугоўваць іх на самым сучасным узроўні.

…Ідэю вось такога паштовага самаабслугоўвання нашы паштавікі (па неправераных звестках) падгледзелі ў Парыжы. Таму, калі хочаце ўявіць сябе там, калі ласка… Паводле слоў прыветлівых гаспадынь, з 9 гадзін раніцы да 9 вечара на Старажоўскай, 8 у Мінску, а далей — дасць Бог, паўсюль можна будзе (як мінімум) купіць свежы нумар «Звязды», выпіць кубачак кавы і адчуць асалоду ад таго, што пра гэта (для Вас!) нехта паклапаціўся.

Валянціна ДОЎНАР.

НА ЗДЫМКАХ: начальнік вытворчасці «Мінская пошта» Жанна ШЭБЕКА; аператары Алёна ГАРДЗІЦКАЯ і Кацярына ТОЛКАЧ.

Весткі з месцаў

«СЕМ ДЗЁН» МІХАІЛА ВАСІЛЬЕВІЧА

У Івянецкім музеі традыцыйнай культуры экспануецца выстава твораў дырэктара ААТ «Валожынэнерга» М.В. Станкевіча. Ён, выпускнік Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, мае генетычную прагу да творчасці, якая праяўляецца ў шматграннай стваральнай дзейнасці. Працуе Міхаіл Васільевіч у жанры пейзажа, партрэта, стварыў шэраг кампазіцый міфалагічна-гістарычнага накірунку. На выставе прадстаўлена серыя карцін «Сем дзён». Натхнёны адвечнай кнігай жыцця «Бібліяй» — адным з самых унікальных помнікаў сусветнай культуры — мастак праілюстраваў усе этапы стварэння сусвету. Шматфігурныя кампазіцыі ўключаюць выявы Бога-Айца, людзей, прадстаўнікоў флоры і фаўны, фантасмагарычнай прасторы…

Творы майстра знаходзяць станоўчыя водгукі, наводзяць на філасафічны роздум аб Быцці.

Алег РАМАНОЎСКІ, *г.п. Івянец.*

Падзяка

МАЁ СЭРЦА АДМАЎЛЯЛАСЯ ПРАЦАВАЦЬ…

Хачу праз вашу газету шчыра падзякаваць дактарам Мінскай 4-й клінічнай бальніцы прафесару Ю. Астроўскаму, І. Губарэвічу, А. Жыгалковічу, а таксама А. Мядзведзевай і В. Сеўрукевічу. Гэта менавіта сапраўдныя дактары. Яшчэ не так даўно я, па сутнасці, знаходзіўся на мяжы паміж жыццём і смерцю, маё сэрца адмаўлялася працаваць, я нават не мог зрабіць і дзесятка крокаў. Так было, пакуль я не патрапіў да гэтых спецыялістаў, якія паставілі мне на сэрцы два клапаны. Была складаная аперацыя, якая працягвалася каля 6 гадзін. Гэта небывалае пачуццё — адчуць сябе зноўку здаровым, зноў радавацца гэтаму жыццю і мець колішняе жаданне жыць. Вялікі «дзякуй» вам, дактары з 4-й. У вас сапраўды залатыя рукі.

Іосіф КАЗЛОЎСКІ, *г. Ліда.*

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 12 (544)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прадаецца

■ Дом пад знос, нядорага.
Тэл.: (8-01797) 43-165, 8-029-682-63-01.

■ Дом з г/п, 120 км ад Мінска, побач чыгунка, нядорага.
Тэл. (8-01797) 43-463, раніцай і ўвечары.

■ Кватэра ў будуемым 2-кватэрным доме з магазінам-майстэрняй (11 км ад Брэста), пастаянная сумесная справа.
Тэл. 8-029-601-69-81.

■ Дача 2003 г. пабудовы, цагляная, дах металічны, шклопакеты, свята, вада, гараж, лазня, 2 цяпліцы, пасека, 20 сотак зямлі.
Тэл. 8-0297-54-08-85.

■ Вялікі драўляны дом у в. Чабусы Любанскага раёна, маюцца г/п, сад, 60 сотак зямлі, добрыя транспартныя зносіны.
Тэл.: (8-01710) 61-645, 8-029-320-90-78.

■ Дом, сад, агарод, 3 км ад г. Мядзел.
Тэл. (8-01797) 38-170.

■ Прадам ці размяняю 3-пакаёвую кватэру, балкон, кабельнае TV, дамафон у г. Беразіно.
Тэл. (8-01715) 56-360.

■ Прадам ці здам у арэнду дом з г/п, лазняй, маецца сад, агарод, побач лес, рака, зручны пад'езд, у Бярэзінскім раёне.
Тэл. (8-017) 231-16-23.

■ ВАЗ-2101, 1982 г.в., прабег 79 тыс. км.
Тэл. (8-017) 231-16-23.

■ «VW-пасат» В3, 1990 г.в., 1,8 мона, шэры металік, седан, цэнтр. замок, эл. люк, добры стан. 3,5 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8-029-762-19-62.

■ Касілка навясная трактарная.
Тэл. 8-029-699-80-87.

■ Два кабаны жывой вагой па 4500 руб. за 1 кг.
Тэл. (8-01797) 43-463, раніцай і ўвечары.

■ Самаробны трактар з прычэпам — 950 у.а., электрарухавік 3,0 кВт, цыркулярка, карданны вал ЗІЛ-130, бароны.
Тэл. (8-01770) 35-363, пасля 15.00.

■ «VW-пасат», 1985 г.в., 1,6Д, хэтчбэк, 1100 у.а.
Тэл.: (8-01715) 48-699, 8-029-257-13-94.

■ «VW-джэта», 1992 г.в., 1,6ТД, цэнтр. замок, люк, сігналізацыя, гаражнае захаванне, выдатны стан, колер рубінавы, 3250 у.а., торг.
Тэл. 8-029-771-51-78.

■ «Гольф 2», 1,6ТД, 1992 г.в., чырвоны.
Тэл.: (8-01716) 40-254, пасля 19.00, маб. 133-49-66.

■ Электракацёл КПЭ-60 на 60 л для варкі ежы з нержавейкі, вулей на 16 рамак, новы, рысоры для прычэпа «Зубраня».
Тэл. (8-01710) 27-972.

■ Кабан вагой 150 кг, жывой вагой па 4500 руб. за 1 кг.
Тэл. 8-029-796-17-49.

■ Бульбасаджалка 4-радковая, акучнік новы, сеялка для высеву агародніны, агрэгаты да МТЗ.
Тэл. 8-029-936-28-09.

■ Пліта газавая «Гефест» (брэсцкая), новая.
Тэл.: (8-017) 295-96-84, 8-029-654-11-62.

■ Бульба буйная, магчыма дастаўка.
Тэл.: (8-01717) 30-820, 8-029-403-10-76.

■ Прычэп 2ПТС-4.
Тэл. (8-01596) 23-000.

■ Пчаласем'і, пчолапакеты нядорага.
Тэл. 8-029-173-03-59.

Куплю

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі і паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8-029-850-17-29.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8-029-655-07-16.

■ Трактар МТЗ, Т-25 у любым стане, с/г агрэгаты да іх ці абмяняю на легкавы аўтамабіль.
Тэл. 8-029-936-28-09.

■ Грузавы дызельны ГАЗ, ЗІЛ, КамАЗ ці МАЗ з дакументамі ці абмяняю на легкавы аўтамабіль.
Тэл. 8-029-936-28-09.

■ Прычэп 2ПТС-4 з дакументамі.
Тэл. (8-01793) 42-391.

■ Мотакаляску інвалідную з рухавіком ІЖ 70—80-х гадоў, можна няспраўную.
Тэл. (8-017) 290-17-38.

■ Грузавы аўтамабіль ЗІЛ, ГАЗ ці трактар МТЗ-80, 82.
Тэл. 8-029-324-84-06.

Рознае

■ Брыгада выканае ўсе будаўнічыя работы хутка і якасна з матэрыялу заказчыка.
Тэл. 8-029-761-87-25.

РУСП «МИНСКОЕ ПЛЕМПРЕДПРИЯТИЕ»

ПРОДАЕТ:

■ девять пчелосемей в очень хорошем состоянии по цене 180 000 руб. за семью;

■ отводки (пакеты) 3 шт. по цене 80 000 руб. за штуку.

Тел.: (8-01717) 727-29, 8-029-404-03-48.

ВІНШАВАННІ

Любую жонку ***Валянціну Іванаўну ЛОЙ*** *шчыра віншую з юбілеем. Дай Божа табе моцнага здароўя, шчасця і радасці на доўгія гады.*

Сяргей, *г. Жыткавічы.*

Віншуем ***Алега Мікалаевіча СУРАНА*** *з в. Горная Рута з 25-годдзем. Жадаем здароўя, кахання, згоды і шчасця.*

Родныя.

Сардэчна віншуем дарагую мамачку і бабулю ***Яўгенію Сяргееўну*** *з в. Капцэвічы з юбілеем. Добры ты наш, дарагі чалавек, хай паболей працягнецца жыццёвы твой век.*

Дачка, зяць, унукі, *в. Лучыцы.*

Любы, дарагі наш ***Віктар Лявонцьевіч КАЗЛОЎСКІ,*** *віншуем з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, бадзёрасці, поспехаў, цяпла і дабра.*

Родныя, *в. Ж.-Барок.*

У суд Цэнтральнага раёна г. Мінска паступіла заява аб аб'яўленні памерлым грамадзяніна **Ласкаўца Алега Леанідавіча,** 20 студзеня 1961 года нараджэння, апошняе вядомае месца пражывання і знаходжання — г. Мінск, вул. Нававіленская, д. 9, кв. 6. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра А.Л. Ласкаўца, паведаміць іх суду Цэнтральнага раёна горада Мінска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд горада Жодзіна Мінскай вобласці паступіла заява аб аб'яўленні памерлым грамадзяніна **Лук'яновіча Васіля Паўлавіча,** 12 мая 1962 года нараджэння, ураджэнца в. Балажэвічы Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, які пражываў раней па праспекту Леніна, дом 15, кв. 50 у г. Жодзіне. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра В.П. Лук'яновіча, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява Бойка Ж.І. з просьбай да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна **Бойку Валерыя Мікалаевіча,** 26 кастрычніка 1970 года нараджэння, ураджэнца с. Аляксандраўка Азоўскага раёна Растоўскай вобласці, РФ, які пражываў у в. Повіць, вул. Школьная, д. 2, Кобрынскага раёна, месцазнаходжанне якога невядома, у адносінах да якога ўзнікае пытанне аб аб'яўленні яго памерлым, паведаміць іх суду на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання аб'явы.

У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Прымачука Аляксея Афанасьевіча,** 27 жніўня 1928 года нараджэння, ураджэнца с. Стараселле, Маневіцкага раёна, Валынскай вобласці, Украіна, апошняе месца знаходжання — горад Рэчыца Гомельскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра А.А. Прымачука, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна (г. Рэчыца, вул. К. Маркса, 30) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У суд Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Леановіча Васіля Васільевіча,** 25 студзеня 1951 года нараджэння, ураджэнца в. Макава Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, апошняе месца жыхарства — вул. Акцябрская, д. 30, кв. 27, г. Ганцавічы Брэсцкай вобл. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра В. В. Леановіча , паведаміць іх суду Ганцавіцкага раёна на адрас: 225432, г. Ганцавічы, вул. Камуністычная, 21, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

Бухгалтерский баланс СООО «Белкоопстрах» за 2006 год

220004, г. Минск, пр-т Победителей, 17; тел. 226-78-91 *тыс. руб.*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	906401,1	**Источники собственных средств, всего**	1667378,1
Нематериальные активы	8258,6	В том числе: уставный фонд	1046656,4
Финансовые вложения, всего	617,9	резервный фонд	87232,7
в том числе: инвестиции в дочерние общества		добавочный фонд	199527,2
инвестиции в др. организации	617,9	фонд накопления	164194,7
облигации и др. долговые обязательства		фонд потребления	
прочие финансовые вложения		целевое финансирование	
Доля перестраховщиков в страховых резервах	203067,5	нераспределенная прибыль прошлых лет	
Дебиторы, всего	530837,8	нераспределенная прибыль отчетного года	169767,1
в том числе:дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	77258,3	**Страховые резервы и фонды,всего**	6270364,6
		в том числе: страховые резервы	6136930,4
депо премий по рискам, принятым в перестрахование		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	117262,5
